*Інстытут гісторыі НАН Беларусі* | *Цэнтральная навуковая бібліятэка ім. Якуба Коласа НАН Беларусі* | *Лідскі гісторыка-мастацкі музей*

***праводзяць навукова-практычную канферэнцыю***

# «ЛІДА І ЛІДСКІ КРАЙ У ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ (ДА 700-ГОДДЗЯ ГОРАДА)»

**Запланаванае поле канферэнцыі:**

- Лідчына ў святле археалагічных крыніц;
- Ліда і Лідскі павет у складзе Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай;
- Лідчына ў канцы XVIII – пачатку XX стст.;
- Лідчына ў міжваенны перыяд 1921–1939 гг.;
- Ліда і Лідскі раён у перыяд Другой сусветнай вайны і пасляваеннага аднаўлення;
- Ліда ў другой палове XX–пачатку XXI стст.;
- Гістарыяграфія і крыніцазнаўства гісторыі Лідчыны;
- Матэрыяльная і духоўная культура рэгіёна;
- Выбітныя ўраджэнцы Лідчыны.

Час правядзення канферэнцыі **8 верасня 2023 г.**

Месца правядзення канферэнцыі: **г. Ліда, Гродзенская вобласць.**

Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі прымаюцца па электроннай пошце dounar_zagor@mail.ru да **8 жніўня 2023 г.**

У заяўцы паведамляецца імя, імя па бацьку і прозвішча дакладчыка, яго навуковая ступень і званне, назва даклада, назва ўстановы, якую прадстаўляе дакладчык, яго пасада, кантактны тэлефон, e-mail.

Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў для выступлення і публікацыі. Пацвярджэнне аб удзеле ў канферэнцыі будзе даслана да **18 жніўня 2023г.**

**Рабочыя мовы канферэнцыі:** беларуская, руская, польская.

Матэрыялы канферэнцыі будуць апублікаваны. Патрабаванні да тэкстаў: да **9 кастрычніка 2023 г.** у аргкамітэт дасылаецца электронны варыянт не болей за 40 000 знакаў, спасылкі пастаронкавыя, нумарацыя спасылак на кожнай старонцы. Першая спасылка на публікацыю даецца цалкам (аўтар, назва, месца і год выдання, старонкі), у наступнай спасылцы месца і год выдання не падаюцца.

*Кантакты*: 220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1, Інстытут гісторыі НАН Беларусі. Тэл. (+375 17) 378-14-09, факс (+375 17) 379-18-34. Доўнар Аляксандр Барысавіч, e-mail: dounar_zagor@mail.ru.

Харчаванне аплочваецца арганізатарамі канферэнцыі, праезд па маршруту Мінск-Ліда-Мінск за кошт арганізатараў.

**Аргкамітэт канферэнцыі**